**Павел Іванавіч Недабораў - камсорг батарэі 529-га знішчальна-супрацьтанкавага артылерыйскага палка 31-ай арміі. Разам з 1-ай паветранай арміяй удзельнічаў у вызваленні Дубровеншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

У адным з баёў Павел Іванавіч знішчыў 6 танкаў.

У наступных баях на Дубровеншчыне гармата Недоборова была выведзена з ладу. Пра гэта ён напісаў сваім бацькам, якія на сямейным савеце вырашылі на свае працоўныя зберажэнні купіць яму новую і сабралі каля 15 тысяч рублёў. Патрыятычнае пачынанне падтрымалі камсамольцы. З новай гарматай, набытай на сродкі сям'і і землякоў, сяржант П.І. Недабораў ўдзельнічаў у вызваленні Гродна і Польшчы, Усходняй Прусіі, скончыў вайну ў Кёнігсбергу.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Славы і медалём “За одвагу”.







**Уладзімір Піліпавіч Падзігун - падпалкоўнік Савецкай Арміі, удзельнік Вялікай Айчыннай войнаў, Герой Савецкага Саюза.**



Уладзімір Падзігун нарадзіўся 11 красавіка 1923 г. у вёсцы Бярозаўка (цяпер - Манькоўскі раён Чаркаскай вобласці Украіны). Скончыў сярэднюю школу. У чэрвені 1941 г. быў прызваны на службу ў Рабоча-сялянскую Чырвоную Армію. З сакавіка 1942 г. - на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

Да лістапада 1943 г. старшы сяржант Уладзімір Падзігун камандаваў аддзяленнем разведкі 472-га артылерыйскага палка 42-й стралковай дывізіі 33-й арміі Заходняга фронту. Вызначыўся падчас вызвалення Віцебскай вобласці Беларускай ССР. 14 лістапада 1943 г. у баі каля населенага пункта Хутары Казьянскія Дубровенскага раёна Падзігун асабіста падарваў адзін дзот праціўніка і прымусіў здацца гарнізон другога дзота. У крытычны момант бою Падзігун замяніў сабой выбыўшага са строю камандзіра стралковага батальёна і паспяхова кіраваў гэтым падраздзяленнем. 23 снежня 1943 г. аддзяленне Падзігуна прайшло ў нямецкі тыл і блакіравала бліндаж праціўніка. У тым баі Падзігун асабіста знішчыў 1 фашыста, яшчэ 1 узяў у палон.



НАГРАДНОЙ ЛИСТ

Подзигун Владимир Филиппович

Старший сержант

1923

с 26 июня 1941 года - отечественная война

Не имеет

Наградлен медалью „за боевые заслуги"

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 жніўня 1944 г. за «ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецкімі захопнікамі і праяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм" старшы сяржант Уладзімір Падзігун быў узнагароджаны высокім званнем Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая зорка».

Пасля заканчэння вайны Падзігун працягнуў службу ў Савецкай Арміі. У 1945 г. ён скончыў Вышэйшую афіцэрскую артылерыйскую школу, у 1948 г. - курсы ўдасканалення афіцэрскага складу, у 1954 г. - Сумскае артылерыйскае вучылішча. У сакавіку 1961 г. у званні падпалкоўніка Падзігун быў звольнены ў запас. Пражываў і працаваў у г. Белая Царква Кіеўскай вобласці. Памёр 28 красавіка 2001 г.

Быў таксама ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 1-й ступені і Чырвонай Зоркі, медалямі.

У гонар Падзігуна названа школа ў вёсцы Жуляны Гродзенскай вобласці Беларусі.




Памятны знак У.П. Падзігуну на Алеі Памяці г. Дуброўна

**Мікіта Іванавіч Смарчкоў - камандзір авіяцыйнай эскадрыллі, гвардыі капітан.**



Нарадзіўся 30 красавіка 1916 г. у вёсцы Трафіменкі Дубровенскога раёна Віцебскай вобласці ў сям'і селяніна. Жыў у горадзе Кемерава, у 1934 г. скончыў 10 класаў сярэдняй школы. Пасля школы быў накіраваны ў Мінусінскую лётна-планерную школу.

У 1935 г. накіраваны інструктарам-планерыстам у горад Рыбінск Яраслаўскай вобласці. Пяць гадоў навучаў моладзь машынабудаўнічага завода палётам на планёры. У мясцовым аэраклубе разам з таварышам Мікалаем Сышчыкавым, асвоіў самастойныя палёты на самалёце У-2. Скончыў Вышэйшую лётна-планёрную школу ў Кактэбелі і быў прызначаны начальнікам планёрнай школы аэраклуба.

Вясной 1940 г. прызваны ў Чырвоную Армію і накіраваны ў ваенную авіяцыйную школу ў горад Балашоў, якая рыхтуе лётчыкаў на бамбардзіроўшчыкі СБ. Але скончыць навучанне перашкодзіла вайна.

У першы дзень вайны, 22 чэрвеня 1941 г., Смарчкоў прызначаны камандзірам звяна 639-га бамбардзіровачнага авіяцыйнага палка. Са снежня 1941 г. па сакавік 1942 г. ён у складзе палка прымаў удзел у баявых дзеяннях на Калінінскім фронце, здзейсніў 16 начных баявых вылетаў на самалёце Р-5. Затым - да студзеня 1943 г. - камандзір звяна 5-га запаснога авіяцыйнага палка. За гэты час асабіста асвоіў самалёт-штурмавік Іл-2 і ў якасці інструктара падрыхтаваў 40 лётчыкаў, за што быў узнагароджаны грашовай прэміяй.


Самалёт-штурмавік Іл-2 пад час боя

З сакавіка 1943 г. да канца Вялікай Айчыннай вайны М.І. Смарчкоў ваяваў у складзе 617-га штурмавога авіяцыйнага палка. Удзельнічаў у баявых дзеяннях на Варонежскім, 1-м, 2-м, 3-м Украінскіх франтах.

Да снежня 1944 г. Смарчкоў здзейсніў 134 баявых вылеты на штурмоўку навал войскаў праціўніка.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 23 лютага 1945 г. гвардыі капітану Смарчкову М.І. прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка».

На заключным этапе вайны капітан Смарчкоў у складзе свайго палка прымаў удзел у баях на тэрыторыі Румыніі, Югаславіі, Венгрыі. Да пераможнага мая 1945 г. на яго рахунку было 196 паспяховых баявых вылетаў.

Пасля вайны працягнуў службу ў родным палку. У 1947 г. быў звольнены ў запас па хваробе. З Грузіі ён пераехаў на Украіну, у Чарнігаў. На працягу доўгіх гадоў ён працаваў у навучальных установах, на прадпрыемствах народнай гаспадаркі.

Памёр 7 верасня 2002 г. Пахаваны ў Чарнігаве на Яцаўскіх могілках.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, Айчыннай вайны 1-й ступені, трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, медалямі і югаслаўскім ордэнам «Партызанская зорка» ІІ-й ступені.

**Марыя Фёдараўна Смірнова – маці Героя Савецкага Саюза Юрыя Смірнова.**

Нарадзілася ў 1898 г. у Кастрамской вобласці ў сялянскай сям'і.

У Вялікую Айчынную вайну страціла мужа пад Сталінградам. Сын Юрый, 1925 г. нараджэння, самы малодшы, загінуў каля вёскі Шалашына Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці.

Стралок, гвардыі малодшы сержант Юрый Смірноў вызначыўся пры вызваленні Віцебскай вобласці. 24 чэрвеня 1944 г. у складзе танкавага дэсанта прарваўся ў тыл ворага каля вёскі Шалашына Дубровенскага раёна. Цяжка паранены ў баі, быў захоплены ў палон. Гітлераўцы падвергнулі яго жорсткім катаванням, але мужны воін не выдаў ворагу ваеннай тайны і быў распяты на сцяне бліндажа. Пахаваны ў г.п. Арэхаўк. 6 кастрычніка 1944 г. Ю.В. Смірнову прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У пасляваенныя гады Марыя Фёдараўна неаднаразова наведвала Дубровенскі раён, выступала перад вучнямі сярэдніх школ, навучэнцамі ГПТУ, калгаснікамі, расказвала пра сына.

Памерла ў 1978 г.





Сын Марыі Фёдараўны – Юрый Смірноў



Помнік Герою Савецкага Саюза Юрыю Смірнову ў вёсцы Буда

**Максім Іванавіч Мухтар-Ландарскі - удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Ураджэнец Дубровенскага раёна.**



Нарадзіўся ў 1894 г. у вёсцы Калінаўка Дубровенскага раёна, Віцебскай вобласці.

У лістападзе 1917 г. – намеснік камандзіра браняпоезда "Пуцілавец", камендант Паўночна-Данецкай чыгункі. У 1918 г. – камандзір атрада асобага назначэння, удзельнічаў у ліквідацыі эсэраўскага мяцежа ў гг. Орша і Горкі. З канца 1919 г. – камандзір часцей асобага назначэння па барацьбе з бандытызмам у раёне Лепеля і Сянно. У лістападзе 1921 г. – на Туркменскім фронце. Пасля вяртання ў Беларусь – камандзір атрада па барацьбе з бандытызмам у Горацкім і Чаўскім паветах. Да 1941 г. – інжынер, начальнік цэха Маскоўскага электрамеханічнага завода імя Уладзіміра Ільіча.

У 1941 г. добраахвотнікам пайшоў на фронт.

Пасля вайны – начальнік канструктарска-тэхналагічнага бюро Галоўмашпрома.

Імем М.І. Ландарскага названа вуліца ў г. Дуброўна.

Памёр у 1975 г.

Ганаровым грамадзянінам горада Дуброўна з'яўляецца з 1985 г.







**Чэрвень 1941 г. Пасля рэйда на западны бераг Буга.**